ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
2024 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў (далей – агляд-конкурс).

2. Мэтамі і задачамі агляду-конкурсу з'яўляюцца: папулярызацыя і актывізацыя тэатральнага жанру ў вобласці; павышэнне ўзроўню выканальніцкага майстэрства і сцэнічнай культуры аматарскіх тэатральных калектываў; стварэнне новых калектываў, знаёмства і ўмацаванне творчых сувязей паміж тэатральнымі калектывамі вобласці; падтрымка таленавітых кіраўнікоў і ўдзельнікаў.

3. Арганізатарамі агляду-конкурсу з'яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", аддзел культуры Гродзенскага раеннага выканаўчага камітэта (дадатак 1).

4. Арганізатарамі агляду-конкурсу дапускаюцца змены ў дадзенай Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў.

5. Агляд-конкурс праводзіцца 1 раз у 2 гады (сакавік – верасень) у раёнах Гродзенскай вобласці па асобным графіку (дадатак 2).

6. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне ўдзельнікаў агляду-конкурсу адбудзецца на свяце аматарскіх тэатральных калектываў "Несцерка запрашае" 26 кастрычніка 2024 г. на базе Скідзельскага гарадскога дома культуры філіяла ДУК "Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр".

7. У Аглядзе-конкурсе прымаюць удзел лепшыя дзіцячыя і дарослыя аматарскія тэатральныя калектывы вобласці, за выключэннем калектываў з найменнем "народны" ("узорны") і званнем "Заслужаны", якія прайшлі папярэднія адборачныя прагляды на месцах.

8. Калектывы могуць выкарыстоўваць для пастаноўкі спектакляў творы класічных і сучасных аўтараў на беларускай ці рускай мове.

9. Для паказу прадстаўляецца спектакль працягласцю да 60 хвілін.

10. Калектывы прадстаўляюць спектаклі, або відэаверсію спектакляў арганізатарам агляду-конкурсу – спецыялістам ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”.

11. Журы агляду-конкурсу (дадатак 3) узнагароджвае дыпломамі ў рамках і прызамі пераможцаў у дзвюх узроставых катэгорыях (дзіцячая і дарослая) у наступных намінацыях:

- “Драматычны спектакль”;
- “Лялечны спектакль”;
- “Музычна-драматычны спектакль”;
- “Тэатральная мініяцюра”;
- “Літаратурна-паэтычны спектакль”.

12. Журы агляду-конкурсу ўзнагароджвае спецыяльнымі прызамі і дыпломамі у рамках у дзвюх узроставых катэгорыях (дзіцячая і дарослая):

“За лепшую рэжысуру”;
“За лепшае сцэнічнае ўвасабленне твораў нацыянальнай драматургіі”;
“За лепшую жаночую ролю”;
“За лепшую мужчынскую ролю”;
“За лепшы дэбют”.

13. Астатнім калектывам-удзельнікам агляду-конкурсу ўручаюцца дыпломы за ўдзел.

14. Пры падвядзенні вынікаў агляду-конкурсу журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі: майстэрства рэжысёра, акцёрскае майстэрства, сцэнаграфія, музычнае афармленне, касцюміраванне.

15. Журы пакідае за сабой права змяняць альбо вызначаць дадатковыя намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду, а ў выпадку адсутнасці конкурсу ў намінацыі – аб’ядноўваць іх.

16. Рашэнне членаў журы па выніках агляду-конкурсу фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца на афіцыйным сайце ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” на працягу да 10 каляндарных дзён з моманту правядзення Фестывалю.

17. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

18. Лепшыя аматарскія калектывы вобласці па выніках агляду-конкурсу будуць рэкамендаваны да надання найменнія “народны” (“узорны”).

19. Для ўдзелу ў аглядзе-конкурсе неабходна да 16 лютага 2024 года даслаць заяўку з пазнакай “Несцерка запрашае” (дадатак 4) па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, тэл. +375 152 623799, +375 152 623780 тэл/факс: +375 152 62 37 87, e-mail: info@gromc.by.

20. Фінансаванне агляду-конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”.

21. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: прызы, дыпломы і рамкі для дыпломаў.

22. Для фінансавання агляду-конкурсу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

23. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама перанос даты правядзення агляду-конкурсу (у іншыя тэрміны).

24. Арганізатары агляду-конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў

# СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | – намеснік начальніка упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта;* |
| Хільмончык К.В. | – дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", *намеснік старшыні аргкамітэта*; |
| Крывіцкая С.В. | – вядучы метадыст па рабоце з дзецьмі ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Пекар А.Ю. | – галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў Гродзенскага аблвыканкама; |
| Рамановіч Н.І. | – намеснік дырэктара ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" |

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў

СКЛАД ЖУРЫ
абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў

| | | |
|---|---|---|
| Хільмончык К.В. | – | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, *старшыня журы*; |
| Пекар А.Ю. | – | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня журы*; |
| Пятроўская М.А. | – | выкладчык тэатральных дысцыплін УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”, *намеснік старшыні журы*; |
| Крывіцкая С.В. | – | вядучы метадыст па рабоце з дзецьмі ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Рамановіч Н.І. | – | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў

**Форма заяўкі**

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік (загадчык) аддзела (сектарам) культуры гар(рай)выканкама
2024 г.

ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласным аглядзе-конкурсе аматарскіх тэатральных калектываў

1. Поўная назва калектыву і базавая ўстанова дзейнасці калектыву
_______________________________________________________________
_______________________________________________________________
2. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву, кантактны нумар тэлефона ______________________________________________________
_______________________________________________________________
3. Узроставая катэгорыя каллектыву (дзіцячая, дарослая)_____________
4. Колькасць дзеючых асоб у спектаклі ____________________________
5. Конкурсная праграма калектыву (аўтар, назва твора) ______________
_______________________________________________________________
_______________________________________________________________
6. Працягласць спектакля_______________________________________
7. Дата паказу спектакля_______________________________________
8. Адрас і кантактныя тэлефоны_________________________________

Подпіс кіраўніка
базавай установы культуры ________________

Заяўкі на ўдзел у аглядзе-конкурсе дасылаць з пазнакай “Несцерка запрашае” да 16 лютага 2024 года па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”. Кантактныя тэлефоны ў г. Гродна: тэл. +357 152 62 37 99, тэл/факс: +375 152 62 37 87, e-mail: info@gromc.by.